# ЭДГАР АЛАН ПО. УПЛЫЎ БІЯГРАФІЧНЫХ ФАКТАЎ НА ЯГО ТВОРЧАСЦЬ

**В. А. Сергіенка**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*Мінск, Беларусь, olga.sergienko82@gmail.com*

Дадзены артыкул разглядае некаторыя факты жыццёвага і творчага лёсу Эдгара Алана По, іх уплыў на творчасць амерыканскага навеліста.

***Ключавыя словы:*** паэт; навеліст; біяграфічныя звесткі; творчая спадчына.

# EDGAR ALLAN POE. INFLUENCE OF BIOGRAPHICAL FACTS ON HIS CREATIVE WORK

**O. O. Sergienko**

*Belarusian State University,*
*Minsk, Belarus, olga.sergienko82@gmail.com*

This article considers some facts of Edgar Allan Poe’s life and creative destiny and their influence on the work of the American novelist.

***Keywords:*** poet; novelist; biographical facts; creative heritage.

Разглядаючы творчасць пісьменніка або паэта, часта звяртаюцца да яго біяграфіі, да сацыяльна-палітычных і культурных падзей, якія адбываліся ў краіне і ў свеце і якія маглі б паўплываць на жыццё і творчасць аўтара. Я лічу неабходным таксама звярнуць увагу на жыццёвы і творчы лёс Эдгара Алана По, перш чым аналізаваць яго творы, бо такія змрочныя, трагічныя і адначасова прываблівыя вобразы і матывы, як смерць, жах, вар'яцтва, паўстанне з мёртвых і іншыя, не маглі ўзнікнуць адразу або пад уплывам аднаго якога-небудзь фактара. Найхутчэй, яны складваліся і развіваліся паступова, адлюстроўваючы працэсы і змены, якія адбываліся ў жыцці паэта і навеліста, а таксама і ў грамадстве таго часу.

Даследчыкаў біяграфіі Э. По было шмат: яна прываблівала сваёй таямнічасцю і загадкавасцю. Пры жыцці і пасля смерці аб ім хадзілі легенды, вартыя самых неверагодных апавяданняў самога навеліста. Шмат пакаленняў крытыкаў і даследчыкаў імкнуліся разгадаць загадку, якую пакінуў пасля сябе амерыканскі рамантык: загадку жыцця і творчасці. Біяграфічныя міфы часта супярэчылі адзін аднаму, як і спробы аналізу яго творчай спадчыны. Асабліва разыходзіліся погляды наконт яго вершаў і псіхалагічных, або "жахлівых" навел, бо ў розныя часы іх тлумачылі па-рознаму, абапіраючыся на розныя тэорыі і меркаванні.

Нават і сёння няма аднолькавага разумення яго тэм і матываў, не вырашана, хто ён – геній ці вар'ят.

Я звяртаюся да дзвюх крыніц, якія лічацца найбольш грунтоўнымі і дакладнымі ў тым, што датычыцца біяграфічных звестак. Гэта "Эдгар Алан По. Навеліст і паэт" Ю. Кавалёва і "Эдгар По" Герві Алена.

Трэба сказаць, што лёс Э. По (1809 – 1849) склаўся трагічна. Сын акцёраў, ён рана асірацеў, і яго ўзяла на выхаванне бяздзетная пара Аланаў з Рычманда. Багатая сям'я кіравалася зусім не высакароднымі прынцыпамі, гэта была даніна модзе на дабрачыннасць. Таму маленькі Эдгар, вельмі ўражлівы, рана зведаў самоту і адчай. Хлопчык, мабыць, адчуваў, што ласкі, якімі асыпала яго прыёмная маці, на самой справе прызначаліся не яму, а яе ўласнаму сыну, які так і не нарадзіўся ў іх з Джонам Аланам, што ён есць чужы хлеб (аб чым яму не аднойчы нагадвалі), што жыве толькі з ласкі яго дабрадзеяў. Маленства По – гэта зачыненыя лонданскія пансіёны (у Алана былі справы ў Англіі, і сям'я пражыла там пяць гадоў), нудны будзённы распарадак, зубрэнне, педантычныя настаўнікі. Потым, мабыць, ён менавіта пра гэты пансіён узгадвае ў навеле "Уільям Уільсан", калі апіша і сцяну вакол школьнага ўчастка, утыканую бітым шклом, і масіўныя вароты з прываранымі жалезнымі шыпамі, і прагулкі па нядзелях да суседняй царквы і назад –як у астрозе. Пасля вяртання на радзіму Эдгар По прадоўжыў адукацыю ў класічнай школе. Ён захапляўся англійскай, французскай, грэчаскай і лацінскай мовамі і літаратурай, вылучаўся талентам і ў дакладных навуках. Менавіта тут у жыццё маленькага хлопчыка ўвайшла багіня –ідэал прыгажосці, спачування і дабрыні – маці школьнага сябра – Джэйн Стэнард. Яе нечаканая смерць у 1824 годзе перажывалася Эдгарам як цяжкі ўдар, вялікая жыццёвая страта. Але гэта будзе толькі першая страта любімага чалавека ў нядоўгім жыцці пісьменніка. Праз два гады Эдгар По становіцца студэнтам Віргінскага ўніверсітэта. Але праз канфлікт з апекуном Джонам Аланам быў вымушаны пакінуць не толькі ўніверсітэт, у якім правучыўся толькі адзін год, але і родны дом. "З гэтага моманту яго нязменнымі спадарожнікамі сталі цяжкая праца пісьменніка, які ніколі не ішоў на кампрамісы з кан'юктурнымі густамі публікі, зневажальная беднасць, страта самых блізкіх людзей, горкая самота і роспач" [1, с. 28].

Першыя паэтычныя зборнікі – "Тамерлан і іншыя вершы" ("Tamerlane and Other Poems", 1827), які ствараўся пад уплывам англійскіх рамантыкаў, асабліва Дж.Г.Байрана, Дж.Кітса, П.Б.Шэлі, і " Аль Аарааф" ("Al Aaraaf", 1829) – не прынеслі яму прызнання і не выправілі матэрыяльнае становішча. По пачаў пісаць празаічныя апавяданні, прымаць удзел у творчых конкурсах, каб зарабіць грошай. Але і гэта прынесла яму толькі багаты жыццёвы і літаратурны вопыт. Пачалася актыўная праца Э. По ў

якасці рэдактара аднаго з часопісаў, які выдаваўся ў Рычмандзе. Хуткі поспех малавядомага часопіса ўмацаваў рэпутацыю пісьменніка як аднаго з найлепшых журналістаў, але штодзённая напружаная праца вымотвала, адымала сілы і час, пазбаўляла магчымасці сур'ёзна займацца мастацкай творчасцю, і ён пачаў пакутаваць ад душэўнай дэпрэсіі, якой не было раней. Тут трэба дадаць, што ў гэты час Э. По пазнаёміўся са сваёй цёткай Марыяй Клем і яе дачкой Вірджыніяй. Ён моцна закахаўся ў сваю дванаццацігадовую кузіну, і праз кароткі час узаемнае каханне прывяло да рамантычнага шлюбу. Яго жонка Вірджынія стала добрым памочнікам ва ўсіх нягодах. Але яна хварэла на сухоты і хутка памерла (1846). Э. По страшэнна пакутаваў, і хоць адзін з яго апошніх зборнікаў псіхалагічных навел "Гратэскі і арабескі" ("Tales of the Grotesque and Arabesque", 1840) і верш "Крумкач" ("The Raven", 1844-1849) прынеслі нарэшце яму славу, смерць Вірджыніі стала ўдарам, ад якога ён не адышоў да канца сваіх дзён. По пераўжыў яе толькі на два гады.

У псіхалагічных, ці "жахлівых" навелах, якія ўвайшлі ў апошні зборнік Эдгара По, і ў многіх вершах яскрава прасочваецца цяга да катастрафічных сюжэтаў, змрочных падзей, злавесных абставін, да агульнай атмасферы безнадзейнасці і адчаю, да матываў смерці і жыцця, да глыбіняў чалавечай псіхікі і звязаных з ёю загадкавых з'яў. Многія даследчыкі звязвалі гэта з трагічнай і кароткай біяграфіяй паэта, пісьменніка і крытыка, выказваючы меркаванні, што горкія абставіны жыцця негатыўна паўплывалі на яго псіхіку, што яго страх перад беднасцю і смерцю даходзіў да вар'яцтва і апанаванасці змрочнымі малюнкамі і думкамі. Некаторыя нават абвінавачвалі яго ў схільнасці да некрафілізму.

Так, у яго шмат твораў пра смерць. Нават просты матэматычны падлік выяўляе, што смерць або вобразы, звязаныя з ёю, з'яўляюцца самай неадступнай тэмай Э. По. І вельмі лёгка знайсці гэтаму біяграфічныя тлумачэнне, бо жыццё амерыканскага рамантыка сапраўды аказалася чарадой страт. А можа, ён прадчуваў, што і яму нядоўга засталося жыць. Аднак я лічу, што тут трэба пагадзіцца са словамі А. Зверава, аўтара прадмовы да зборніка "Эдгар Аллан По. Стихотворения": "Але ў паэзіі жыццёвы факт, нават які валодае такім вялізарным і трагічным значэннем, як смерць, сам па сабе існаваць не можа. Ён павінен увайсці ў пэўную сістэму паэтычнага мыслення, праламацца праз складаную гаму асацыяцый, суадносін, урасці ў цэласны вобраз свету, які з'яўляецца з тому вершаў." [2, с. 28].

Такім чынам, хоць і нельга пагадзіцца з меркаваннем, што толькі зыходзячы з біяграфіі можна інтэрпрэтаваць творчасць Эдгара По, у той жа час нельга і цалкам адштурхнуць яе, бо некаторыя вобразы амерыканскі навеліст усё ж такі ўзяў са свайго жыцця. Так, напрыклад, знешні выгляд яго жонкі, яе хвароба, некаторыя рысы характару былі адлюстраваны ў

лірычных гераінях яго твораў ("Лігея", "Эўлалія", "Элеанора" і інш.). Кволыя, бледныя, нібы нябожчыцы, яны амаль што заўсёды былі сваячкамі сваіх каханых і амаль што заўсёды хутка паміралі, пакідаючы лірычнага героя сам-насам са сваім горам і адчаем. Так пакінулі Эдгара По яго прыёмная маці і маці яго школьнага сябра, якіх ён абагатвараў і якія сталі ідэаламі прыгажосці для рамантыка, а сама думка, што ён можа страціць яшчэ і Вірджынію, прыводзіла яго ў стан, блізкі да вар'яцтва. Але хоць гэтыя факты і адбіліся на яго творчасці, можна з упэўненасцю сказаць, што не яны адыгралі галоўную ролю пры выбары матываў і тэм.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Малюковіч С., Саркісава Н.* У палоне журбы: Паэзія Эдгара По і амерыканскі рамантызм // Роднае слова. 2003. №5-6.
2. *По Э.А.* Стихотворения. Сборник. Сост. Е. К. Нестерова. На англ. яз. с параллельным русским текстом. М.: Радуга. 1988.